ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Воранаўскага райвыканкама
Л.А.Калонас

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб раённым конкурсе сярод публічных бібліятэк**
**ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка”**
**“На лепшую самаробную кнігу”**

## 1.Мэты і задачы Конкурсу

Раённы конкурс “На лепшую самаробную кнігу” (далей–Конкурс) праводзіцца ў межах 500 — годдзя беларускага кнігадрукавання да Дня беларускага пісьменства і друку.

Конкурс праводзіцца з мэтай папулярызацыі кнігі і чытання праз творчасць і фантазію; развіцця і падтрымкі навыкаў асоб, якія захапляюцца літаратурна-мастацкай творчасцю і выяўленчым мастацтвам; стымулявання і стварэння ўмоў для рэалізацыі творчай актыўнасці сярод насельніцтва Воранаўскага раёна.

## 2. Парадак і ўмовы правядзення Конкурсу

2.1. Заснавальнікі Конкурсу ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка”.

2.2. Конкурс разлічаны на тэрмін з 1 сакавіка да 25 жніўня 2017 года.

2.3. Удзельнікам Конкурсу можа быць любы жыхар Воранаўскага раёна, ці аўтарскі калектыў.

2.4. Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:

- “На лепшае мастацкае афармленне ўласнага твора”;
- “На лепшае мастацкае афармленне твора (ці яго ўрыўка) беларускага аўтара”;

2.5. Асноўныя крытэрыі ацэнкі творчых работ:

- арыгінальнасць ідэі;
- граматнасць(дакладнасць) зместу кнігі;
- наяўнасць ілюстрацый;
- разнастайнасцьтэхнікі выканання і выкарыстаных для афармлення матэрыялаў;
- адпаведнасць вызначанай намінацыі.

2.6.Патрабаванні да конкурсных работ:

- канкурсныя работы афармляюцца толькі на беларускай мове;
- фармат кнігі – не большы за А3, абавязкова павінны быць вокладка, тытульны ліст, змест; аб’ём работы – не больш за 30 старонак фармату А4 у рукапісным выглядзе;

- творчыя работы могуць быць выкананы з прымяненнем любога матэрыялу і ў любой тэхніцы, за выключэннемкамп'ютарных тэхналогій;

- удзельнічаць у Конкурсе не могуць кнігі ў канцылярскіх папках, фотаальбомах з файламі, сшытках і г.д.

2.7. Разам з конкурснай работай накіроўваюцца звесткі пра аўтара (прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, месца вучобы (клас) ці месца працы (пасада), месца пражывання, кантактныя тэлефоны), ці аўтарскі калектыў.

2.8. Творчыя работы, якія не адпавядаюць умовам Конкурсу, журы не разглядае.

2.9. Матэрыялы прымаюццада 25 жніўня 2017 года па адрасе:
231391 г.п. Воранава, вул. Савецкая, 29, ДУК "Воранаўская раённая бібліятэка" (з паметкай "На конкурс").

2.10. Прэзентацыя калекцыі самаробных кніг, сфарміраваная з лепшых работ, адбудзецца падчас святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ў Воранаўскай раённай бібліятэцы (6 верасня 2017 года)

2.11. Фотаздымкі работ будуць размешчаны на сайце ДУК "Воранаўская раённая бібліятэка " .

2.12. Конкурсныя работы аўтарам не вяртаюцца (будуць выкарыстоўвацца ў якасці выставачнага матэрыялу падчас мерапрыемстваў, накіраваных на папулярызацыю кнігі і чытання, краязнаўчай дзейнасці, а таксама да юбілеяў пісьменнікаў, дзеячаў культуры і г.д.).

**3. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў Конкурсу**

3.1. Вынікі Конкурсу падводзяцца да 1верасня 2017 года на пасяджэнні журы і афармляюцца пратаколам. Выпіска з пратакола размяшчаецца на сайце ДУК "Воранаўская раённая бібліятэка " .

3.2. Па кожнай намінацыі вызначаюцца пераможцы – I, II, III месцы.

3.3. Пераможцы Конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Воранаўскага райвыканкама і прызамі.

3.4. Узнагароджанне пераможцаў адбудзецца падчас святкавання Дня беларускага пісьменства (6 верасня 2017 года)

**СКЛАД**
**журы раённага конкурсу сярод публічных бібліятэк**
**ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка”**
**“На лепшую самаробную кнігу”**

Сідаровіч Л.А., намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Воранаўскага райвыканкама – старшыня журы;

Сушынская Т.Р., дырэктар ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка” – намеснік старшыні журы;

Юрго В.М., загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка” – сакратар журы.

**Члены журы:**

Вазбановіч Т.З., намеснік дырэктара ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка”;

Фурман Л.І., метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка”.

Велігор А.М., загадчык філіяла “Воранаўская дзіцячая бібліятэка” ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка”.

Кузьміцкая В.Ч., загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка”.